# Чалавек са сваімі прынцыпамі



*12 мая вядомаму беларускаму дзяржаўнаму дзеячу, журналісту і дыпламату Уладзіміру БРОВІКАВУ споўнілася б 70 гадоў*

У навейшай айчыннай гісторыі ёсць старонкі, якія яшчэ не адно дзесяцігоддзе будуць выклікаць самыя розныя, нават процілеглыя, ацэнкі і падыходы. Бо такая ўжо яна, наша матухна-гісторыя: лепшае мы «бачым» і ацэньваем толькі праз многа-многа гадоў; горшае ж проста замоўчваем, не «хочам» бачыць... Дзякуй Богу, што хоць рана ці позна ўсё становіцца на свае месцы!

1990 год займае ў нашым гістарычным летапісе калі і не адметны, дык вельмі цікавы і важны радок. У канвульсіўных сутаргах у прамым сэнсе слова вяла барацьбу за сваё далейшае выжыванне Камуністычная партыя, пазіцыі якой як «кіруючай і накіроўваючай сілы» грамадства яшчэ літаральна ўчора здаваліся цвёрдымі і непахіснымі. На двух крэслах, разрываючыся паміж ужо ўяўнымі «ўладамі», сядзеў М. Гарбачоў: апошні са шматлікіх генсекаў партыі і першы (і апошні) прэзідэнт Саюза ССР. Тую ж уладу так хацелася ўтрымаць — і яму асабіста, і бліжэйшым з акружэнцаў яго, але як тысячы простых людзей, так, несумненна, і яны самі ўжо разумелі: наперадзе вялікія і адказныя перамены. Аб гэтым, уласна кажучы, і засведчылі два пленумы ЦК КПСС, праведзеныя практычна без перапынку: у лютым і сакавіку таго ж 1990-га...

Двойчы на тых партыйных форумах запар выступіў член ЦК КПСС, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Савецкага Саюза ў Польшчы Уладзімір Бровікаў. Як, якім чынам удалося яму два разы трапіць у лік выступоўцаў, застанецца тайнай назаўсёды...

Лютаўскі пленум ЦК абмяркоўваў пытанне для таго часу больш чым «жыццёва важнае»: праект платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда партыі і даклад генеральнага сакратара ЦК КПСС М. Гарбачова па гэтаму пытанню. 5 лютага ў спрэчках па дакладу слова атрымаў У. Бровікаў.

На трыбуну пленума, як і большасць з удзельнікаў-прамоўцаў яго, ён выйшаў упэўненай, цвёрдай паходкай. Вопытны і спрактыкаваны партыйны функцыянер (а да 1990-га Уладзімір Ігнатавіч паспеў папрацаваць сакратаром Віцебскага абкама Кампартыі Беларусі, 6 гадоў — у апараце ЦК КПСС (1972—1978), цэлую пяцігодку — з 1978 па 1983-і — другім сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі), Бровікаў выдатна разумеў, што гэты пленум не з тых, на якіх можна, што называецца, ліць ваду, словаблудствам славіць ці то саму партыю, ці то яе «мудрых» кіраўнікоў. Ён добра ўсведамляў: прыйшоў час вызначыцца з асабістай, сапраўднай жыццёвай пазіцыяй, заняць нарэшце месца ў рэальным жыцці... Таму і пачаў ён сваё выступленне без уступу:

*— Я падзяляю думку тых з выступаўшых да мяне, хто сказаў, што дакумент (а гэта, нагадаю, праект платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда партыі. —* ***Заўв. аўт.****), які абмяркоўваецца намі, у такім выглядзе, у якім ён нам прадстаўлены, наўрад ці прымальны і мае патрэбу ў сур'ёзнай дапрацоўцы. Яго залішняя лозунгавасць і нават некаторая крыклівасць, недакладнасць, я сказаў бы, ацэнак мінулага і асабліва цяперашняга, што ўтрымліваецца ў ім, ідэйны эклектызм і адсутнасць тэарэтычнай яснасці не дазваляюць яму пакуль прэтэндаваць на ролю праграмнага дакумента нашай партыі. Ствараецца ўражанне, што дакумент носіць утылітарны характар і заклікаsuccessfully задавальняць цяперашнія патрэбы нашай палітыкі...*

Зала прыціхла, насцярожылася: з трыбуны гучаў сапраўды выклік трымальнікам улады. А прамоўца тым часам «ішоў» далей: «Грамадства, бачыце, літаральна змарнела без пасады прэзідэнта, — у прамым сэнсе здзекаваўся У. Бровікаў з перабудоўшчыкаў, — ...а партыя, аказваецца, ніяк не можа пражыць без «старшыні і двух ягоных намеснікаў»... Ён абвінаваціў вышэйшае кіраўніцтва тагачаснай краіны ў «татальнай дэмакратызацыі грамадства» і забыцці «другога боку медаля — навядзення дысцыпліны і парадку ў дзяржаве», адсутнасці павагі да законаў, у захапленні «актыўнасцю ў словах», «нерашучасці і бездапаможнасці ў барацьбе з антыдзяржаўнымі, антыграмадскімі з'явамі і акцыямі»... Пасол СССР у Польшчы заклікаў кожнага дзяржаўнага і партыйнага чыноўніка да адказнасці на сваёй пасадзе, а ўсю трагедыю ўбачыў у тым, што «мы ніяк не можам адмовіцца ад аднаасобнай улады ў дзяржаве і партыі». «Рашыўся на гэта выступленне таму, — сказаў Уладзімр Ігнатавіч напрыканцы выступлення, — што лічу неабходным нарэшце адмовіцца яшчэ ад адной заганы, якая прынесла нам нямала бед у мінулым, калі мы сваіх вышэйшых кіраўнікоў з усёй смеласцю і адвагай крытыкавалі толькі пасля іх фізічнай ці палітычнай смерці».

Калі ён пакідаў трыбуну, у зале гучалі апладысменты. Адкрыта і смела з ім пагаджаліся многія ўдзельнікі пленума ЦК КПСС... А некаторыя і падтрымалі ў сваіх выступленнях на ім.

Наступны, сакавіцкі пленум ЦК, абмяркоўваў праект Статута КПСС, вызначыў тэрміны склікання XXVIII з'езда партыі, правядзення ў ёй справаздачна-выбарнай кампаніі. Той форум доўжыўся, дарэчы, роўна тыдзень(!), а У. Бровікаў выступаў на ім адным з першых.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы